У Цэнтральную камісію Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў
220010 г. Мінск, вул. Савецкая, 11 (Дом урада)
Падаўца скаргі: Лагвінец Аляксандр Іванавіч
(прозвішча, імя, імя па бацьку, месца жыхарства
220019 г. Мінск, вул. Чайлыткі, д. 13, кв. 47, тэл. 315 84 09, 029 509 9093
асобы, якой было адмоўлена ў рэгістрацыі ў якасці кандыдатата)

Орган, дзеянні якога абскарджваюцца:
Акруговая выбарчая камісія
па Сухараўская выбарчай акрузе №102,
г. Мінск, вул. Кальварыйская, 39
(назва і месца знаходжання камісіі, якая адмовіла ў рэгістрацыі)

**Скарга**

На рашэнне Акруговай выбарчай камісіі па Сухараўскай выбарчай акрузе №102
(назва выбарчай камісіі)
аб адмове ў рэгістрацыі ў якасці кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь.

18 жніўня 2008 г. у адпаведнасці з артыкулам 65 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь я, Лагвінец Аляксандр Іванавіч, звярнуўся ў Акруговую выбарчую камісію па Сухараўскай выбарчай акрузе №102 (г. Мінск, вул. Кальварыйская, 39) з заявай аб рэгістрацыі мяне ў якасці кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь па Сухараўскай выбарчай акрузе №102.

Сваім рашэннем ад 28 жніўня 2008 г. Акруговая выбарчая камісія па Сухараўскай выбарчай акрузе №102 адмовіла мне ў рэгістрацыі ў якасці кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь. У сваім рашэнні Акруговая выбарчая камісія спасылаецца на Артыкул 68 ч. 6 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь, што нібыта я падаў непраўдзівыя звесткі ў маёй Дэкларацыі аб даходах і маёмасці.

Лічу, што Акруговая выбарчая камісія па Сухараўскай выбарчай акрузе №102 паставілася да пададзеных мной дакументаў прадузята і неаб'ектыўна, не ўлічыўшы істотныя моманты, якія падцвярджаюць факт чыста тэхнічнай памылкі у складванні сумаў маіх даходаў, атрыманых з-за мяжы.

У Пункце 7 Раздзелу 1 Дэкларацыі аб даходах і маёмасці, што я падаваў у якасці асобы, якая вылучаная кандыдатам у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, мною пазначана сума агульнага гадавога даходу за 2007 г. у памеры 8 390 596 беларускіх рублёў, якая поўнасцю адпавядае агульнай суме майго даходу за 2007 г., зафіксаванай у Падатковай дэкларацыі (разліку) па падаходным падатку за 2007 год. Гэта азначае, што сума ў памеры 251,72 еўра, якая у выніку чыста тэхнічнай памылкі не была ўключаная ў Пункт 4 Раздзелу 1 Дэкларацыі аб даходах і маёмасці ў суму маіх даходаў, атрыманых з-за мяжы, з'яўляецца ўлічанай ў агульнай суме майго даходу за 2007 г. (8 390 596 беларускіх рублёў). Менавіта з сумы ў 8 390 596 беларускіх рублёў мною аплачаны падаходны падатак за 2007 г. у памеры 549 670 беларускіх рублёў.

Факт адпаведнасці агульнай сумы майго даходу за 2007 г. (8 390 596 беларускіх рублёў), пазначанай мной у Дэкларацыі аб даходах і маёмасці, суме майго агульнага гадавога даходу за 2007 г., пазначанай у маёй Падатковай дэкларацыі (разліку) па падаходным падатку за 2007 год, падцвярджаецца Інфармацыяй у Акруговую

выбарчую камісію з Інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Фрунзенскім раёне г. Мінска №1. Я таксама падаў заяву ў дадзеную Інспекцыю з просьбай адмыслова падцвердзіць дадзены факт. Копія заявы знаходзіцца ў далучаных дакументах.

Таксама звяртаю ўвагу на тое, што ў прадстаўленых мною ў Акруговую выбарчую камісію дакументах Дэкларацыі аб даходах і маёмасці дакументах (на 18 аркушах) на аркушы 11 знаходзіцца копія мемарыяльнага ордэру №786757 ад 14 снежня 2007 г. на суму ў 251,72 еўра, якая у выніку чыста тэхнічнай памылкі не была ўключаная ў Пункт 4 Раздзелу 1 Дэкларацыі аб даходах і маёмасці ў суму маіх даходаў, атрыманых з-за мяжы. Сам факт прадстаўлення ў Акруговую выбарчую камісію ў тым ліку і гэтага дакумента не можа не сведчыць пра адсутнасць якой-кольвек задумы з майго боку падаваць непраўдзівыя звесткі аб маіх даходах.

Згаданыя факты паказваюць на неўважлівы або прадузяты разгляд Акруговай выбарчай камісіяй прадстаўленых мною дакументаў.

Таму перакананы, што ў Акруговай выбарчай камісіі не было дастатковых падставаў для адмовы ў маёй рэгістрацыі ў якасці кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь па Сухараўскай выбарчай акрузе №102.

На падставе вышэйназванага, кіруючыся арт. 65 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь, прашу:

1. Адмяніць рашэнне Акруговай выбарчай камісіі па Сухараўскай выбарчай акрузе №102 ад 28 жніўня 2008 г. аб адмове ў маёй рэгістрацыі ў якасці кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь па Сухараўскай выбарчай акрузе №102.

2. Абавязаць Акруговую выбарчую камісію па Сухараўскай выбарчай акрузе №102 правесці рэгістрацыю мяне, Лагвінца Аляксандра Іванавіча, у якасці кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь па Сухараўскай выбарчай акрузе №102.

Да заявы дадаюцца на ___ аркушах:

1. Копія рашэння аб адмове ў рэгістрацыі ў якасці кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў.
2. Копія Дэкларацыі аб даходах і маёмасці.
3. Копія Інфармацыі ў Акруговую выбарчую камісію з Інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Фрунзенскім раёне г. Мінска №1.
4. Копія Разліку падаходнага падатку, дзе ўказаны памер агульнай сумы майго даходу за 2007 год і якая была далучаная мною да Дэкларацыі аб даходах і маёмасці на аркушы 1.
5. Копія мемарыяльнага ордэру №786757 ад 14 снежня 2007 году, якая была далучаная мною да Дэкларацыі аб даходах і маёмасці на аркушы 11.
6. Копія квітанцыі аб ўплаце падаходнага падатку, якая была далучаная мною да Дэкларацыі аб даходах і маёмасці на аркушы 2.
7. Копія заявы ў Інспекцыю Міністэрства па падатках і зборах па Фрунзенскім раёне г. Мінска №1 з просьбай падцвердзіць факт улічэння сумы ў памеры 251,72 еўра ў агульную суму майго даходу за 2007 г.

“30” жніўня 2008 г. ______________________________

(подпіс асобы, што падае скаргу)